## INFINITIVUS PRAESENTIS PASSIVI

Infinitīvus praesentis passīvi (інфінітыў цяперашняга часу залежнага стану) утвараецца ад асновы infectum з дапамогай суфіксаў **-ri**/**-i**:

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Аснова infectum** | + | **-ri**<br>**-i** | **(I, II, IV спр.)**<br>**(III спр.)** |

З а ў в а г а. У IIIб спражэнні канцавы галосны асновы **ĭ** выпадае.

| Дзеяслоў | laud-o, 1 *хваліць* | doce-o, 2 *вучыць* | audi-o, 4 *слухаць* | scrib-o, 3а *пісаць* | stru-o, 3а *будаваць* | faci-o, 3б *рабіць* |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Аснова infectum | laudā- | docē- | audī- | scrib- | stru- | facĭ- |
| *Inf. praes. pass.* | laudā-**ri** | docē-**ri** | audī-**ri** | scrib-**i** | stru-**i** | fac-**i** |
| Пераклад | *хвалíцца кімсьці* | *вучы́цца кімсьці* | *слухацца кімсьці* | *апісвацца кімсьці* | *будавацца кімсьці* | *рабіцца кімсьці* |

## PRAESENS INDICATIVI PASSIVI

Praesens indicatīvi passīvi (цяперашні час абвеснага ладу залежнага стану) утвараецца за дапамогай асабовых канчаткаў passīvi (залежнага стану).

**Асабовыя канчаткі passīvi**

| Асоба | Singulāris | Plurālis |
|---|---|---|
| 1-я | **or** | **mur** |
| 2-я | **ris** | **mĭni** |
| 3-я | **tur** | **ntur** |

**Дзеясловы I, II, IIIб, IV спражэнняў**

Praesens indicatīvi passīvi дзеясловаў I, II, IIIб, IV спражэнняў утвараецца ад асновы infectum з дапамогай асабовых канчаткаў passīvi:

| | | |
|---|---|---|
| **Аснова infectum** | + | **асабовыя канчаткі passīvi** |

З а ў в а г і.

1. У I спражэнні ў 1 *sg.* -**ā** у канцы асновы выпадае.
2. У IIIб, IV спражэннях у 3 *pl.* паміж асновай і канчаткам з'яўляецца злучальны галосны -**u**-.
3. У IIIб спражэнні ў 2 *sg.* -**ĭ** у канцы асновы пераходзіць у **ĕ**.

| Асоба | laud-o, 1 (laudā-) *хваліць* | doce-o, 2 (docē-) *вучыць* | faci-o, 3б (facĭ-) *рабіць* | audi-o, 4 (audī-) *слухаць* |
|---|---|---|---|---|
| | Singulāris | | | |
| 1-я | laud-**or**<br>*я хвалюся кімсьці, мяне хваляць* | doce-**or**<br>*я вучуся кімсьці, мяне вучаць* | faci-**or**<br>*я раблюся кімсьці, мяне робяць* | audi-**or**<br>*я слухаюся кімсьці, мяне слухаюць* |
| 2-я | laudā-**ris** | docē-**ris** | facĕ-**ris** | audī-**ris** |
| 3-я | laudā-**tur** | docē-**tur** | facĭ-**tur** | audī-**tur** |
| | Plurālis | | | |
| 1-я | laudā-**mur** | docē-**mur** | facĭ-**mur** | audī-**mur** |
| 2-я | lauda-**mĭni** | doce-**mĭni** | faci-**mĭni** | audi-**mĭni** |
| 3-я | lauda-**ntur** | doce-**ntur** | faci-**u**-**ntur** | audi-**u**-**ntur** |

**Дзеясловы IIIa спражэння**

Praesens indicatīvi passīvi дзеясловаў IIIa спражэння ўтвараецца ад асновы infectum з дапамогай злучальных галосных і асабовых канчаткаў passīvi:

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| **Аснова infectum** | + | **злучальныя галосныя** | + | **асабовыя канчаткі passīvi** |

Ужываюцца наступныя злучальныя галосныя:

**-ĭ-** перад **m**, **s**, **t**

**-u-** перад **n**

**-ĕ-** перад **r**

| Асоба | scrib-o, 3a (scrib-) *пісаць* | stru-o, 3a (stru-) *будаваць* |
|---|---|---|
| | Singulāris | |
| 1-я | scrib-**or** | stru-**or** |
| | *я апісваюся кімсьці, мяне апісваюць* | *я будуюся кімсьці, мяне будуюць* |
| 2-я | scrib-**ĕ**-**ris** | stru-**ĕ**-**ris** |
| 3-я | scrib-**ĭ**-**tur** | stru-**ĭ**-**tur** |
| | Plurālis | |
| 1-я | scrib-**ĭ**-**mur** | stru-**ĭ**-**mur** |
| 2-я | scrib-**i**-**mĭni** | stru-**i**-**mĭni** |
| 3-я | scrib-**u**-**ntur** | stru-**u**-**ntur** |

## Незалежная і залежная канструкцыі



**Незалежная канструкцыя**

Дзяўчынка (дзейнік, суб'ект) чытае (незалежны стан) казку (дапаўненне, аб'ект).

**Залежная канструкцыя**

Казка (дзейнік, аб'ект) чытаецца (залежны стан) дзяўчынкай (дапаўненне, суб'ект).

## Ablativus auctoris

Ablatīvus auctōris (творны склон дзеючай асобы) абазначае адушаўлёны суб'ект дзеяння ў залежнай канструкцыі. Адказвае на пытанне *кім утвараецца дзеянне?* Заўсёды ўжываецца з прыназоўнікам *a* (*ab*), які не перакладаецца: Fabŭla **a puellā** legĭtur. — *Казка чытаецца* ***дзяўчынкай***.